


**Рисунок 4 – Коэффициенты рождаемости и смертности в Белорусском Полесье**

4) вторая половина первого десятилетия 21-го века ознаменовалась уменьшением показателей депопуляции, хотя показатели естественного прироста по-прежнему носят отрицательный характер.

Литература

1. Кириенко Е.Г. Социально-экономическая география Республики Беларусь: учеб. пособие / Е. Г. Кириенко. – Минск: Аверсэв, 2003. – 400 с.
2. Смоліч А. Географія Беларусі / А. Смоліч. – 4-е выд. – Мінск: Беларусь, 1993. – 382 с.
3. Природа Белоруссии: Попул. энцикл. / Белорус. Сов. Энцикл.; [редкол.: И.П. Шамякин (гл. ред) и др.]. – 2-е изд. – Минск: БелСЭ, 1989. – 599 с.
4. Антипова, Е. А. Регионы Беларуси: особенности демографического развития и трудовой потенциал сельской местности: монография / Е. А. Антипова, Б. А. Манак. – Минск: БГПУ, 2007. – 232 с.
5. Манак Б.А. Полесский регион Беларуси: этнодемографический портрет / Б.А. Манак, Е. А. Антипова // Геаграфія: праблемы выкладання. – 2007. – № 1. – С. 3-12.
6. Антипова Е.А. Геодемографические проблемы и территориальная структура сельского расселения Беларуси / Е. А. Антипова. – Минск: БГУ, 2008. – 327 с.
7. Корженевич С.В. Территориальные особенности естественного движения населения Белорусского Полесья / С. В. Корженевич // Веснік Брэсцкага універсітэта. Серыя прыродазнаўчых навук. – 2008. – № 2. – С. 99-106.

## АСНОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ ГАЛІНЫ КІНАМАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ Ў ПЕРЫЯД СІСТЭМНАЙ ТРАНСФАРМАЦЫІ

Д.А. Крывашэй
*Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, г. Мінск, Беларусь*

Беларускае кінамастацтва як і іншыя галіны культуры ў найноўшай гісторыі Рэспублікі Беларусь перажыло перыяд заняпаду і адраджэння. Новыя сацыяльна-эканамічныя ўмовы пачатку 1990-х гадоў садзейнічалі творчаму ўздыму і стварэнню новых суб'ектаў кінапрацэсу, якія былі незалежнымі ад дзяржавы.

Яшчэ ў маі 1991 г. Саюз кінематаграфістаў рэспублікі на сваім VII з'ездзе прыняў культурна-камерцыйную праграму, якая прадугледжвала наладжванне ўласнай кіна- відэавытворчасці, развіццё альтэрнатыўнага пракату фільмаў, больш актыўнае супрацоўніцтва з прэсай і бізнесам, падтрымку кінафестываляў і іншых культурных акцый у сферы кіно. У рамках выканання праграмы ў 1993 г. пры Саюзе былі створаны творчыя студыі.

Існаванне незалежных студый садзейнічала жанравай разнастайнасці беларускага кіно. Менавіта яны імкнуліся ствараць эксперыментальныя некамерцыйныя стужкі. Аднак жорсткія рэаліі часу прымусілі вытворцаў быць больш прагматычнымі, арганізоўваць сваю дзейнасць у адпаведнасці з патрабаваннямі рынку: улічваць запыты гледачоў, змены кан'юнктуры рынку, выкарыстоўваць маркетынгавыя стратэгіі пры вытворчасці і продажы карцін. Хутка змянілася і жанравая накіраванасць. Пачалі здымаць баявікі[28], дэдэктывы, камедыі. Адной з найбольш прыбытковых у пракаце стала знятая ў 2000 г. ЗАТ "Відэакампанія "Відэафакт" эксцэнтрычная камедыя "Армія вырaтавання" (рэж. Я. Краўцоў). Росквіт студый скончыўся крызісам сярэдзіны 1990-х гадоў.

Новыя ўмовы перыяду сацыяльна-эканамічнай трансфармацыі не спрыялі развіццю кінавытворчасці. На развіццё галіны кінавытворчасці адмоўна паўплывала скарачэнне аб'ёмаў дзяржзаказу, знікненне цэнтралізаванай сістэмы кінапракату, адсутнасць прафесіянальнай маркетынгавай службы. Не садзейнічала развіццю і стварэнне самастойных кінавідэааб'яднанняў (шасці абласных і мінскага гарадскога). Іх дзейнасць не падлягала адзінай пракатнай палітыцы. У выніку імкненне да прыбытку прывяло да рэпертуарнага дысбалансу на карысць амерыканскай забаўляльнай кінапрадукцыі і знікненню з экранаў фільмаў беларускай вытворчасці.

На калегіі Міністэрства культуры ў сакавіку 1994 г. разглядалася пытанне стану і перспектыў нацыянальнай кінематаграфіі. Размова ішла не столькі пра развіццё, колькі пра захаванне беларускай кінематаграфіі ў складаных умовах пераходу да рыначнай эканомікі [1].

У снежні 1996 г. Урад краіны прыняў пастанову "Аб дадатковых мерах па захаванню і развіццю нацыянальнай кінематаграфіі і павышэнню ўзроўню кінавідэаабслугоўвання насельніцтва". Дакумент прадугледжваў распрацоўку ў 1997 г. праекта Закона "Аб кіно". Апошні быў прыняты толькі ў 2004 г. пад назвай "Закон аб кінематаграфіі ў Рэспубліцы Беларусь" і быў накіраваны на вырашэнне не толькі сацыяльна-эканамічных, але і ідэалагічных пытанняў. Ён вызначыў асноўныя прынцыпы і напрамкі дзяржаўнай палітыкі ў сферы кінематаграфіі, увёў вызначэнне "нацыянальны фільм".[29]

---

[28] Першы беларускі дэдэктыў "Д'ябальская карусель" быў зняты на студыі "Фобос-С" рэжысёрам Н. Грабенкіным ў 1994 г.

[29] Дадзенае вызначэнне не з'яўляецца знаходкай беларускіх заканатворцаў. Такі тэрмін утрымлівае мадэльны закон "Аб дзяржаўнай падтрымцы кінематаграфіі", прыняты на чатырнаццатым пленарным паседжанні Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў-удзельнікаў СНД ў кастрычніку 1999 г. Адпаведна яму: "нацыянальны фільм – твор, які адлюстроўвае спецыфіку нацыянальнай кінематаграфіі. Дадзенае вызначэнне выкарыстоўваецца ў мэтах стварэння сістэмы абароны аўтарскіх і сумежных правоў на тэрыторыях сваіх дзяржаў, стварэння ўмоваў развіцця нацыянальнай кінавытворчасці, пракату і паказу фільмаў, прадстаўлення іх на міжнародных фестывалях і конкурсах, удзелу ў

У прыведзенай ніжэй табліцы 1 мы параўноўваем асноўныя задачы, над вырашэннем якіх працавала кінагаліна ў 2001-2005 і 2006-2010 гг. [2, с. 80-81; 3, с. 103]. З яе відаць, якія змены адбыліся ў асобных ключавых напрамках дзейнасці.

Табліца 1. Параўнанне асноўных задач кінагаліны ў 2001-2010 гг.

<table>
<tr><th>2001-2005</th><th colspan="2">2006-2010</th></tr>
<tr><td>павелічэнне выпуску сумесных беларуска-расійскіх мастацкіх, дакументальных і мультыплікацыйных фільмаў</td><td colspan="2">- актывізацыя работы па рэалізацыі сумесных кінапраектаў і прыцягненне дадатковых інвестыцый у кінавытворчасць;<br>- прыцягненне расійскіх кінематаграфістаў для рэалізацыі беларускіх і сумесных кінапраектаў (рэжысёраў, кампазітараў, аператараў, мастакоў);</td></tr>
<tr><td>развіццё тэхнічнай і тэхналагічнай базы фільмавытворчых прадпрыемстваў</td><td colspan="2">- паэтапная рэалізацыя інвестыцыйнага праекта комплекснай мадэрнізацыі матэрыяльна-тэхнічнай базы кінастудыі з выкарыстаннем найноўшых тэхнічных і тэхналагічных дасягненняў;<br>- тэхнічнае параснасчэнне Белвідэацэнтра і рэканструкцыя будынка прадпрыемства</td></tr>
<tr><td>развіццё заканадаўчай і нарматыўнай базы кінавідэагаліны</td><td colspan="2">далейшае ўдасканаленне нарматыўнай прававой базы кінематаграфіі</td></tr>
<tr><td>падрыхтоўка кадраў маладых творчых работнікаў</td><td colspan="2">сістэмная падрыхтоўка і перападрыхтоўка творчых і тэхнічных кадраў для фільмавытворчасці ў беларускіх і расійскіх ВНУ кінематаграфіі. Арганізацыя стажыровак маладых кінематаграфістаў</td></tr>
<tr><td>Асваенне:<br>выпуску тэлесерыялаў<br>выпуску прадукцыі на відэаносьбітах</td><td rowspan="5">Новыя мэты</td><td></td></tr>
<tr><td>стварэнне ўмоў па ўкараненню гукавых стандартаў "Dolby Stereo" ў кінатэатрах і відэапаказу ў стандартным і перасоўным варыянтах</td><td></td></tr>
<tr><td>павелічэнне долі паказу нацыянальнай кінавідэапрадукцыі на беларускіх тэлевізійных каналах</td><td>- шырокае прыцягненне кансультантаў па спецыфічных пытаннях рэалізацыі інвестыцый</td></tr>
<tr><td>пашырэнне паказу айчыннай кінавідэапрадукцыі ў рамках фестываляў і Дзён кіно за мяжой</td><td>- паляпшэнне інфармацыйна-рэкламнай работы на ўсіх этапах вытворчасці фільма</td></tr>
<tr><td>павышэнне ўзроўню кінематаграфічных мерапрыемстваў, што праводзяцца ў рэспубліцы</td><td>- актывізацыя пошуку сцэнарнага матэрыялу шляхам правядзення тэматычных конкурсаў, мэтавай перапрацоўкі (напісанне пад заказ) літаратурных твораў, закупкі аўтарскіх правоў у расійскіх аўтараў</td></tr>
</table>

У мэтах павелічэння эфектыўнасці рэалізацыі кінавідэапрадукцыі пачынаючы з 2006 г. быў зменены парадак фінансавання вытворчасці мастацкіх фільмаў з унясеннем у каштарыс выдаткаў на інфармацыйна-рэкламную падтрымку кінавідэа-

---

сумеснай кінавытворчасці з улікам міжнародных нормаў і пагадненняў". Акрамя гэтага, значная колькасць палажэнняў згаданага дакумента ўвайшла ў беларускі закон без якіх-небудзь змен.

праектаў, якія ствараюцца па дзяржаўным сацыяльна-творчым заказе. У пачатку XXI стагоддзя ў Беларусі адзінай з постсавецкіх краін захоўвалася амаль стопрацэнтнае дзяржаўнае фінансаванне кінавытворчасці [4, с. 18-20].

У вывучаемы перыяд незваротным стаў працэс скарачэння стацыянарных кінаўстановак, што прыводзіла да скарачэння колькасці гледачоў. За перыяд з 1990 па 2001 год агульная колькасць кінаўстановак скарацілася ў 2,3 раза (у сельскай мясцовасці – у 2 разы), колькасць месцаў для гледачоў – у 1,8 раза. Самае вялікае скарачэнне кінаўстановак (у 2,6 разы) адбылося ў Гомельскай вобласці. Агульная лічба наведванняў скарацілася ў 10,5 разы (гл. табліцу 2) [5, с. 17].

Табліца 2. Колькасці кінаўстановак і відэаустановак, наведанне [6, с. 126; 7, с. 245; 8, с. 23, 31; 9, с. 46, 48].

| | 1990 | 1991 | 1993 | 1995 | 2000 | 2001 | 2003 | 2005 | 2007 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| кінаўстановак | 6916 | 5976 | 4168 | 3780 | 3063 | 2951 | 2329 | 1997 | 1715 |
| наведвальнікаў (млн.) | 117 | 94 | 30 | 12,4 | 11,8 | 11 | 8,4 | 8,7 | 8,7 |
| відэаўстановак | 483 | | | 266 | 331 | 346 | | 459 | 583 |
| наведвальнікаў (млн) | 4,8 | | | 1,3 | 2,2 | 2,3 | | 4,4 | 5,4 |

Як сведчаць дадзеныя табліцы 2, падзенне колькасці кінаўстановак і наведання адбывалася ва ўвесь даследуемы перыяд. Толькі ў 2005-2007 г. назіралася адносная стабілізацыя на ўзроўні 8,7 млн. наведвальнікаў пры скарачэнні кінаўстановак. Побач з гэтым адбываліся працэсы пашырэння выкарыстання іншых відаў экранных тэхналогій: адкрываліся новыя відэазалы, развівалася кабельнае тэлебачанне. Найбольшы эфект з пункту гледжання пашырэння рэпертуару і паляпшэння якасці паказу мела выкарыстанне відэапраектных установак. На канец 2006 г. у краіне дзейнічала каля 400 такіх відэасістэм [10, с. 126]. У наступныя гады іх колькасць працягвала расці, і ў 2007 г. іх налічвалася 583 адзінкі. Гэты паказчык на 100 адзінак пераўзышоў 1990 г.

Аналіз колькасных паказчыкаў кінавытворчасці ў вывучаемы перыяд не дазваляе гаварыць аб заўважных станоўчых зменах. У 1992 г. на кінастудыі "Беларусьфільм" было выпушчана 30 стужак (ігравых, дакументальных, анімацыйных), у 1993 г. гэты паказчык склаў 26, у 1994 г. – 28, 1995 г. – 24, 1996 г. – 24, 1997 г. – 22, 1998 г. – 32, 1999 г. – 18, 2000 г. – 20, 2001 г. – 19, 2002 г. – 14, 2003 г. – 14 [10, с. 131]. У 2004 г. былі зняты 13 (без уліку дакументальных), у 2005 г. – 19, 2006 г. – 22 (з іх 2 стужкі – "Формула кахання" і "Маёр Ветраў" выйшлі ў пракат у 2007 г. і ўвайшлі ў афіцыйную справаздачу за 2007 г.), 2007 г. – 22 (5 мастацкіх (без уліку дзвюх агавораных раней), 5 мультыплікацыйных і 12 дакументальных кінастужак) [30] [11].

Нават пры нязначным выпуску айчынных фільмаў пракатныя арганізацыі ў рэгіёнах не мелі сродкаў для набыцця іх копій. Напрыклад, фільм "Павадыр" у 2002

---

[30] Чатыры з стужкі 2007 г. былі дэбютнымі для маладых рэжысёраў, выпускнікоў БДАМ А. Голубева ("Чаклун і Румба") і Д. Скварцова ("Шчыт айчыны"), для выпускніцы Усерасійскага дзяржаўнага інстытута кінематаграфіі М. Мажар ("Ворагі"), а таксама для сцэнарыста А. Крыніцынай (Сурыкавай) ("Радзіма ці смерць").

г. не набылі тры вобласці, фільм "Зорка Венера" – адна. Дрэнна была пастаўлена рэклама айчынных фільмаў. У выніку фільм "У жніўні 44-га" у Мінскай вобласці паглядзела 16 723 чалавека (з іх у Мінску – 10 099), а ў Брэсцкай амаль ў 4 разы меней – 4 425 чалавек [12, с. 60]. Лепшыя паказчыкі былі ў "Анастасіі Слуцкай" – у сталіцы стужку паглядзела 72 753 чалавека (да сярэдзіны 2004 г.). Для параўнання адзначым, што амерыканскі фільм "Гладыятар", які дэманстраваўся ў той жа перыяд, сабраў 155 553 чалавека [13, с. 139].

Адной з праблем кінагаліны ў вывучаемы перыяд была кадравая. У 1989 г. у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў пачалася падрыхтоўка рэжысёраў ігравога і дакументальнага кіно. У 1997 г. быў здзейснены першы выпуск па спецыяльнасцях "рэжысёр і мастак анімацыйнага кіно" і "кінааператар".

Значнай праблемай была праблема забеспячэння спецыялістамі сярэдняга звяна, тэхнічнымі супрацоўнікамі. Востра стаяла пытанне падрыхтоўкі менавіта спецыялістаў "сярэдняга звяна". У 2003 г. пры Акадэміі мастацтваў пачалі працаваць платныя курсы па падрыхтоўцы такіх спецыялістаў: асістэнтаў рэжысёра, мастакоў і асістэнтаў мастакоў па касцюмах, менеджэраў у галіне кіно і тэлебачання, грымёраў, гукааператараў, асістэнтаў аператара, мастакоў-мульціплікатараў [13, с. 144].

У краіне была распрацавана Міжведамасная праграма падрыхтоўкі кадраў для кінавідэагаліны на 2006-2015 гг., якая прадугледжвае аптымізацыю сістэмы падрыхтоўкі адпаведных спецыялістаў. Пры Беларускім дзяржаўным інстытуце праблем культуры была створана лабараторыя эканамічных і прававых пытанняў кіно [2, с. 79].

Нягледзячы на цяжкасці, у краіне рэгулярна праводзіліся кінафестывалі. У 1993 г. студыяй "Тэле-АРС" быў заснаваны штогадовы фестываль-агляд постсавецкага ігравога кіно "Лістапад". У 1996 г. ён набыў дзяржаўны статус і ператварыўся ў Міжнародны кінафестываль краін СНД і Балтыі, а пазней – Мінскі Міжнародны кінафестываль. З 1993 г. у краіне праводзіўся Міжнародны фестываль жаночага кіно. З 1997 г. – фестываль аматарскіх і студэнцкіх фільмаў. У 1998 г. дзіцячая кінастудыя "Даквіст" правяла першы міжнародны фестываль анімацыйных фільмаў "Анімаёўка". Пазней ён стаў праводзіцца ў Магілёве. З 1997 г. праводзіўся Нацыянальны фестываль беларускіх фільмаў у Брэсце.

Пабач з пэўнымі дасягненнямі, аб выхадзе галіны з крызісу пакуль нельга гаварыць. 12 верасня 2008 г. Прэзідэнт краіны наведаў новы шматзальны кінатэатр "Беларусь" ў Мінску. У час наведання кіраўнік дзяржавы закрануў праблемныя бакі галіны. Была звернута ўвага на вельмі нізкі працэнт фільмаў беларускай вытворчасці, якія дэманструюцца. У кінатэатрах краіны ў 2008 г. паказвалі 36% фільмаў вытворчасці ЗША. 30% расійскіх, 24% еўрапейскіх і толькі 5% вытворчасці кінастудыі "Беларусьфільм". Прэзідэнт даручыў з 2009 г. вывесці кінагаліну Беларусі на самаакупнасць. Гаворка ішла аб неабходнасці пераходу на новыя формы працы, калі рэжысёр зацікаўлены ў прасоўванні свайго прадукту на кінарынку. Былі адзначаны праблемы з кадрамі. Сярэдні ўзрост рэжысёраў складаў 60 гадоў. На думку кіраўніка дзяржавы, да вытворчасці кінапрадукцыі неабходна прыцягваць маладых перспектыўных спецыялістаў [14].

Такім чынам, кінавытворчасць перажывала нялепшыя часы. Творчы ўздым пачатку 1990-х гадоў перайшоў у зацяжны крызіс. Адмоўны ўплыў аказала раз'яднанне кінавытворчасці і кінапракату. На дзяржаўным узроўні неаднаразова прымаліся рашэнні па захаванню і рэфармаванню галіны. Нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы, была наладжана паступовая мадэрнізацыя тэхнічнай базы галіны, пачалася падрыхтоўка ўласных кадраў.

Літаратура

1. Аб сучасным стане і перспектывах нацыянальнай кінематаграфіі. Пастанова калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 14.03.1994. № 6 // Асноўныя службовыя дакументы. 1994. 1 паўгоддзе / Нацыянальная Бібліятэка Рэспублікі Беларусь. – 1994. – С. 19-26.

2. Беларуская культура сёння. Гадавы агляд. 2007. – Мінск: БелДІПК, 2008. – 135 с.

3. Беларуская культура сёння. Гадавы агляд. 2005. – Мінск: БелДІПК, 2006. – 315 с.

4. Беларуская культура сёння. Гадавы агляд. 2001. – Мінск: БелДІПК, 2002. – 68 с.

5. Аб мерах па ўдасканаленню кінавідэаабслугоўвання насельніцтва рэспублікі / Рашэнне калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 5 снежня 2002 г. № 14 п. 1 / Асноўныя службовыя дакументы. 2002. 1 паўгоддзе / Нацыянальная бібліятэка Рэспублікі Беларусь. – 2002. – С. 15-19.

6. Краткий статистический сборник «Республика Беларусь в цифрах», 2006 (Стат. сб.) Минстат Республики Беларусь. – Минск, 2006. – 346 с.

7. Краткий статистический сборник «Республика Беларусь в цифрах», 1995 (Стат. сб.) Минстат Республики Беларусь. – Минск, 1996. – 268 с.

8. Учреждения культуры и искусства Республики Беларусь в 2007 г. Статистический сборник / Мин. стат. и анализа Респ. Беларусь. – Минск, 2008. – 83 с.

9. Учреждения культуры и искусства Республики Беларусь: Стат. сб. / М-во статистики и анализа Беларуси; [Редкол.: В.С.Метеж (пред.) и др.]. – Минск: Статиздат Минстата Беларуси, 2002. – 82 с.

10. Беларуская культура сёння. Гадавы агляд. 2006. – Мінск: БелДІПК, 2007. – 186 с.

11. Итоги 2007 года / Афіцыйны сайт кінастудыі "Беларусьфільм". [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.belarusfilm.by/rus/representative/~page__m11=7~news__m11=238.

13. Беларуская культура сёння. Гадавы агляд. 2002. – Мінск: БелДІПК, 2003. – 207 с.

12. Гісторыя кінамастацтва Беларусі. У 4 т. (1986-2003 гг.) / Л.М. Зайцава [і інш.]; навук. рэд. Л.М. Зайцава. – Мінск: Бел. Навука, 2004. – Т. 4.

14. Александр Лукашенко посетил многозальный кинотеатр «Беларусь» в Минске // Афіцыйны інтэрнет-партал Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.president.gov.by/press62077.print.html.

## ГЛОБАЛИЗАЦИЯ: ИМПЕРАТИВНОСТЬ ИЛИ АЛЬТЕРНАТИВНОСТЬ

А.А.Лазаревич

*Институт философии Национальной академии наук Беларуси, г. Минск*

На тему глобализации говорят и пишут очень много. Меньше других, может быть, в центре внимания оказываются такие вопросы: что есть глобализация – процесс, содержащий альтернативы и варианты, или же процесс неизбежный, однонаправленный, императивный; ведет ли этот процесс к созданию однородной мироцелостности или же содержит в себе возможности разных национально-культурных спецификаций; является ли этот процесс порождением новейших сдвигов в производстве, информатике, культуре, или же он имеет свои исторические корни и исторические прецеденты; как могут человеческая ментальность, мировоззрение и сознание реагировать на этот процесс, противостоять ему.